УДК 94(438)323.29“1949/1953”

# СОЮЗ ПОЛЬСКИХ ПИСАТЕЛЕЙ В КУЛЬТУРНОЙ ПОЛИТИКЕ ПОЛЬШИ (1949–1953)

***Л. А. КОЗИК*** [1)]

[1)] *Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

Отмечается, что после Второй мировой войны польские власти были заинтересованы в участии интеллигенции в преобразовании страны. Сам факт присутствия известных творческих деятелей в публичном пространстве в значительной мере обеспечивал легитимность властей, которые не требовали от писателей публично озвучивать свои идейные позиции и не вмешивались в их творческий процесс. Ситуация изменилась в 1949 г., когда руководство Польской Республики заявило о строительстве социализма, что нашло отражение и в культурной политике. Ее главной целью стало формирование нового человека с социалистическим мировоззрением. Важная роль в ее реализации отводилась творческой интеллигенции, в первую очередь писателям. Посредством художественной литературы инженеры человеческих душ должны были создать в обществе новую систему ценностей. Подчеркивается, что для управления творческой интеллигенцией польские власти использовали творческие союзы, кроме того, в руках государства находились деятельность издательств и распространение книжной продукции. Показывается, что Союз польских писателей активно включился в процесс формирования социалистического мировоззрения в обществе. Он транслировал государственный заказ, контролировал творчество писателей, а также проводил с ними идеологическую работу. С 1949 г. от писателей стали требовать создания произведений, которые бы соответствовали социалистическому реализму и пропагандировали новый государственный строй. Контроль за соблюдением государственных установок осуществлялся посредством цензуры, обсуждения в ходе заседаний творческих секций, на съездах Союза польских писателей, на собраниях писателей – членов Польской объединенной рабочей партии, а также на заседаниях культурных комиссий в партийных и государственных структурах. Подчеркивается, что далеко не все писатели соглашались с отведенной им ролью пропагандистов. Отмечается, что появление соцреалистической литературы в Польше в рассматриваемый период свидетельствовало о реализации одной из задач культурной политики польских властей.

***Ключевые слова:*** Польша; Союз польских писателей; культурная политика; социализм; социалистический реализм; инженеры человеческих душ.

# САЮЗ ПОЛЬСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ У КУЛЬТУРНАЙ ПАЛІТЫЦЫ ПОЛЬШЧЫ (1949–1953)

***Л. А. КОЗІК*** [1*]

[1*] *Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

Адзначаецца, што пасля Другой сусветнай вайны польскія ўлады былі зацікаўлены ва ўдзеле інтэлігенцыі ў пераўтварэнні краіны. Сам факт прысутнасці вядомых творчых дзеячаў у публічнай прасторы ў значнай ступені забяспечваў легітымнасць польскіх улад, якія не патрабавалі ад пісьменнікаў публічна агучваць сваю ідэйную пазіцыю і не ўмешваліся ў іх творчы працэс. Сітуацыя змянілася ў 1949 г., калі кіраўніцтва Польскай Рэспублікі заявіла аб будаўніцтве сацыялізму, што знайшло адлюстраванне і ў культурнай палітыцы. Яе галоўнай мэтай стала фарміраванне новага чалавека з сацыялістычным светапоглядам. Важная роля ў яе рэалізацыі адводзілася творчай інтэлігенцыі, перш за ўсё пісьменнікам. Праз мастацкую літаратуру інжынеры чалавечых душ павінны былі стварыць у грамадстве новую сістэму каштоўнасцей. Падкрэсліваецца, што для кіравання творчай інтэлігенцыяй польскія ўлады выкарыстоўвалі

**Образец цитирования:**
Козік ЛА. Саюз польскіх пісьменнікаў у культурнай палітыцы Польшчы (1949–1953). *Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гісторыя.* 2023;4:103–114.
EDN: CKXNIA

**For citation:**
Kozik LA. Polish Writers’ Union in the cultural policy of Poland (1949–1953). *Journal of the Belarusian State University. History.* 2023;4:103–114. Belarusian.
EDN: CKXNIA

**Автор:**
***Любовь Антоновна Козик*** – кандидат исторических наук, доцент; доцент кафедры истории южных и западных славян исторического факультета.

**Author:**
***Lioubov A. Kozik***, PhD (history), docent; associate professor at the department of Southern and Western Slav’s history, faculty of history.
*lubov.kozik@gmail.com*
*https://orcid.org/0000-0003-1243-1046*

CC BY NC

творчыя саюзы, акрамя гэтага, у руках дзяржавы знаходзіліся дзейнасць выдавецтваў і распаўсюджанне кніжнай прадукцыі. Паказваецца, што Саюз польскіх пісьменнікаў актыўна ўключыўся ў працэс фарміравання сацыялістычнага светапогляду ў грамадстве. Ён трансліраваў дзяржаўны заказ, кантраляваў творчасць пісьменнікаў, а таксама праводзіў з імі ідэалагічную работу. З 1949 г. ад пісьменнікаў пачалі патрабаваць напісання твораў, якія б адпавядалі сацыялістычнаму рэалізму і прапагандавалі новы дзяржаўны лад. Кантроль за выкананнем дзяржаўных установак ажыццяўляўся праз цэнзуру, абмеркаванні падчас пасяджэнняў творчых секцый, на з'ездах Саюза польскіх пісьменнікаў, на сходах пісьменнікаў – членаў Польскай аб'яднанай рабочай партыі, а таксама на пасяджэннях культурных камісій у партыйных і дзяржаўных структурах. Падкрэсліваецца, што далёка не ўсе пісьменнікі пагаджаліся з адведзенай ім роляй прапагандыстаў. Адзначаецца, што з'яўленне сацрэалістычнай літаратуры ў Польшчы ў азначаны перыяд сведчыла аб рэалізацыі адной з задач культурнай палітыкі польскіх улад.

***Ключавыя словы:*** Польшча; Саюз польскіх пісьменнікаў; культурная палітыка; сацыялізм; сацыялістычны рэалізм; інжынеры чалавечых душ.

## POLISH WRITERS' UNION IN THE CULTURAL POLICY OF POLAND (1949–1953)

***L. A. KOZIK*** [a]

[a]*Belarusian State University, 4 Niezaliezhnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*

After the end of World War II, the Polish authorities were interested in the participation of the intelligentsia in the post-war transformations. The very fact of the presence of famous figures in the public space gave communists and their allies legitimacy, and they did not directly interfere in the artistic process and did not require writers to declare their ideological positions. The situation changed in 1949, when the leadership of the Polish Republic announced the building of socialism, that also affected the cultural policy. It was stated that its main goal is the formation of a new person with a socialist worldview. An important role in its implementation was assigned to the creative intelligentsia, primarily writers. They were supposed to become engineers of the human souls and form a new system of values in society. The autorities began to use art unions as a means of influencing and controlling the artists. Moreover, at that time the state had taken control of publishing houses and book distribution. The article shows that the Polish Writers' Union was actively involved in the process of forming a socialist worldview in Polish society. It acted as a translator of the state order and at the same time controlled the creative work of writers, carried out ideological work with them. Since 1949, the authorities began to demand a new, socialist content of fiction literature, which should be written in accordance with socialist realism. The writers were supposed to promote the new state system and develop the socialist consciousness in Polish society. Control over the content and its compliance with the state standards was carried out through censorship, discussions in artistic sections and at congresses of the Polish Writers' Union, at meetings of writers who were members of the Polish United Workers' Party, and meetings of various cultural comissious in party and state structures. At the same time, the author mentions that there were some writers who didn't agree with the role of propagandists. It is noted that the appearance of socialist realist literature in Poland during the period under review testified to the realisation one of the tasks of the cultural policy of the Polish authorities.

***Keywords:*** Poland; Polish Writers' Union; cultural policy; socialism; socialist realism; engineers of the human souls.

### Уводзіны

Пасля Другой сусветнай вайны Польшча апынулася ў сферы ўплыву СССР, што прадвызначыла яе палітычнае, сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіццё амаль на 50 гадоў. У першыя пасляваенныя часы ў краіне панаваў рэжым народнай дэмакратыі, які ў палітычнай сферы характарызаваўся наяўнасцю легальнай апазіцыі, што стварала ўяўленне аб існаванні альтэрнатыў далейшага развіцця. Сітуацыя змянілася ў 1947 г., калі ўлада ў Польшчы апынулася ў руках польскіх камуністаў і іх саюзнікаў. Ужо ў снежні 1948 г. Польская рабочая партыя (ПРП) і Польская сацыялістычная партыя аб'ядналіся і стварылі Польскую аб'яднаную рабочую партыю (ПАРП), кіраўніцтва якой заявіла аб пачатку будаўніцтва сацыялізму. У якасці ўзору быў заяўлены савецкі вопыт грамадска-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця.

Гісторыя культурнай палітыкі ў пасляваеннай Польшчы знайшла адлюстраванне ў работах польскіх даследчыкаў. Яны звярталі ўвагу як на сутнасць культурных пераўтварэнняў, так і на пытанні ўзаемаадносін улад з творчай інтэлігенцыяй. Канцэптуальныя падыходы навукоўцаў у Польскай Народнай Рэспубліцы і ў сучаснай Польскай Рэспубліцы маюць істотную розніцу. У перыяд Польскай Народнай Рэспублікі даследчыкі звярталі ўвагу на якасныя змены ў культурным жыцці краіны і грамадства, часам выказвалі крытычныя заўвагі адносна культурнай палітыкі дзяржавы і пазіцыі асобных творчых дзеячаў, але агульная ацэнка дзеянняў улад і развіцця культуры была станоўчай [1]. Пераход Польшчы да дэмакратычнага развіцця адзначыўся ў гістарычнай навуцы свабодай у выбары метадалогіі даследавання і крытычным стаў-

леннем да сацыялістычнага мінулага, у тым ліку да пазіцыі інтэлігенцыі. Апошнюю сталі абвінавачваць у абслугоўванні пануючай ідэалогіі і камуністаў, якія прывялі да залежнасці дзяржавы ад СССР [2–4]. Разам з тым прадстаўнікі сучаснай польскай гістарыяграфіі прадпрымаюць спробы паказаць складанасць функцыянавання розных груп насельніцтва ў недэмакратычным грамадстве і прыводзяць больш узважаныя і тым не менш крытычныя ацэнкі сацыялістычнага мінулага [5–10].

Сярод расійскіх гісторыкаў праблему ўзаемаадносін польскіх улад і інтэлігенцыі ў 1918–1980 гг. вывучаў Р. Р. Юсупаў [11]. Ён з'яўляецца аўтарам абагульняючай работы па гісторыі Саюза польскіх пісьменнікаў (СПП) у 1945–1980 гг. [12]. На думку Р. Р. Юсупава, у першыя пасляваенныя гады ў Польшчы адбываўся канфлікт паміж уладамі і інтэлігенцыяй. У часы польскага сталінізму інтэлігенцыя была падпарадкавана дзяржаўнаму кіраўніцтву. Даследчык адзначае, што пад уплывам крызісаў 1956, 1968, 1970 і 1976 гг. усё больш прадстаўнікоў навукі і культуры адмаўляліся ад афіцыйнай лініі і пераходзілі на бок грамадскай апазіцыі.

Праблему фарміравання масавай сацыялістычнай культуры ў Польшчы і ролю СССР у гэтым працэсе ў 1945–1955 г. разглядае ў сваім дысертацыйным даследаванні В. В. Абожда. Аўтар адзначыла як станоўчыя, так і адмоўныя бакі культурнай палітыкі ПАРП, звярнуўшы ўвагу на тое, што ў азначаны перыяд назіраўся апагей саветызацыі як культуры, так і іншых сфер жыцця польскага грамадства[1].

Мэтай даследавання выступае вызначэнне ролі і месца СПП у культурнай палітыцы польскіх улад у 1949–1953 гг. У артыкуле аналізуюцца асноўныя задачы тагачаснай культурнай палітыкі, выяўляецца ўплыў партыйна-дзяржаўных інстытутаў на творчую дзейнасць пісьменнікаў, характарызуюцца пазіцыі пісьменнікаў і СПП, ацэньваюцца вынікі намаганняў творчай інтэлігенцыі па фарміраванні новай сацыялістычнай культуры.

## Метадалогія даследавання

Пад культурнай палітыкай польскіх улад у артыкуле разумеецца «комплекс аперацыянальных прынцыпаў, адміністратыўных і фінансавых відаў дзейнасці і працэдур, якія забяспечваюць аснову дзеянняў дзяржавы ў галіне культуры»[2]. Рэалізацыя культурнай палітыкі адбываецца шляхам свядомых дзеянняў, накіраваных на дасягненне пэўных культурных мэт. Даследаванне выканана з выкарыстаннем агульнанавуковых і спецыяльна-гістарычных метадаў у адпаведнасці з прынцыпамі навуковай аб'ектыўнасці.

## Палітыка польскіх улад у адносінах да пісьменнікаў у першыя пасляваенныя гады

У першыя пасляваенныя гады польскія камуністы заяўлялі аб дэмакратычных пераменах у грамадстве, у тым ліку ў культуры. У краіне аднаўлялася разбураная эканоміка, праводзіліся сацыяльныя рэформы. Ішла кампанія па барацьбе з непісьменнасцю, была ўведзена бясплатная адукацыя для ўсіх груп насельніцтва, выдаваліся кнігі, выходзіла перыёдыка, адкрываліся бібліятэкі. Аднак, нягледзячы на захады па аднаўленні мірнага жыцця, значная частка насельніцтва Польшчы насцярожана, а часам і варожа ставілася да ўлад. Гэта было звязана як з дзейнасцю польскага ўрада ў эміграцыі, так і з залежнасцю польскіх улад ад СССР. Каб пераламіць негатыўныя настроі, дзяржаўнаму кіраўніцтву неабходна была падтрымка з боку тых груп насельніцтва, якія мелі высокі аўтарытэт у грамадстве. Да ліку такіх груп, несумненна, адносілася інтэлігенцыя[3]. Трэба ўлічваць той факт, што адразу пасля вайны польскія ўлады адчувалі патрэбу ў кваліфікаваных кадрах[4], таму пайшлі на прыцягненне даваенных спецыялістаў да працы ў органах дзяржаўнай і мясцовай улады, арміі, сельскіх гаспадарках і на прадпрыемствах[5].

Сучасныя даследчыкі сыходзяцца ў меркаванні аб тым, што роля інтэлігенцыі ў пасляваенных

---

[1]*Обожда О. В.* Формирование массовой социалистической культуры в Польше и Советский Союз (1945–1955 гг.) : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.03. М. : МГУ им. М. В. Ломоносова, 2006. 26 с.

[2]*Востряков Л.* Культурная политика: основные концепции и модели [Электронный ресурс] // Министерство культуры Архангельской области. URL: https://culture29.ru/upload/medialibrary/0bf/0bfb4cb9753cded37c6339eae422bbc7.pdf (дата обращения: 27.01.2021). Тут і далей пераклад наш. – *Л. К.*

[3]На гэта, напрыклад, звяртаў увагу Я. Берман, які ў другой палове 1940-х – пачатку 1950-х гг. быў членам Палітбюро ЦК ПРП (з 1948 г. – ПАРП) і адказваў за палітыку ў галіне навукі, культуры і ідэалогіі [13, s. 348].

[4]Першы сакратар ПРП У. Гамулка на Пленуме ЦК ПРП 11–12 ліпеня 1945 г. з гэтай нагоды адзначаў: «Наша партыя… патрабуе вялікай колькасці інтэлігенцыі. Інтэлігенцыя – гэта ўмова нашага ўплыву ў масах, у кіруючым і гаспадарчым апараце». На Пленуме ЦК ПРП 3–4 кастрычніка 1945 г. ён жа заявіў, што справа па прыцягненні творчых колаў да пазіцыі афіцыйных улад ідзе вельмі марудна, таму неабходна распачаць «ідэйную і планавую акцыю па "здабычы" інтэлігенцыі». (Archiwum ruchu robotniczego. T. 7. W 40 rocznicę powstania Polskiej Partii Robotniczej / Cent. Arch. KC PZPR. Warszawa : Książka i Wiedza, 1982. S. 97, 124.)

[5]*Hass L.* Inteligencja polska 1945–1980: postawy i zachowania [Zasoby elektroniczne] // Dzieje Najnow. 2002. T. 34, No. 1. S. 74. URL: https://bazhum.muzhp.pl/media/files/Dzieje_Najnowsze_kwartalnik_poswiecony_historii_XX_wieku_/Dzieje_Najnowsze_kwartalnik_poswiecony_historii_XX_wieku_-r2002-t34-n1/Dzieje_Najnowsze_kwartalnik_poswiecony_historii_XX_wieku_-r2002-t34-n1-s73-94/Dzieje_Najnowsze_kwartalnik_poswiecony_historii_XX_wieku_-r2002-t34-n1-s73-94.pdf (data odwołania: 11.03.2023).

параменах у Польшчы ў значнай ступені забяспечвала легітымнасць польскіх улад, большасць прадстаўнікоў якіх былі камуністамі [11, с. 107; 14, s. 115]. Пры гэтым гісторыкі падкрэсліваюць, што важнае значэнне ў прыняцці дзеячамі культуры пасляваеннай рэчаіснасці адыгрывала як агульная атмасфера ў краіне (аднаўленне эканомікі, адсутнасць выразных дэкларацый аб пабудове сацыялізму, публічныя кантакты ўлад з Рымска-каталіцкай царквой, нацыяналізацыя буйной прамысловасці, транспарту і банкаў, правядзенне аграрнай рэформы і інш.[6]), так і захады з боку дзяржавы ў выглядзе дапамогі інтэлігенцыі (забеспячэнне жыллём, магчымасць выдаваць творы, атрыманне грашовай дапамогі і г. д.), прызнання значнасці дадзенай сацыяльнай групы ў развіцці грамадства. Прадстаўнікі інтэлігенцыі мелі свабоду творчасці (праўда, ва ўмовах дзеяння цэнзуры[7] яна была адноснай), а таксама маглі не агучваць публічна сваю ідэйную пазіцыю. Усё гэта стварала ўражанне сталай апекі з боку ўлад, прызнання аўтарытэту інтэлігенцыі, што кантраставала з яе становішчам у міжваенны перыяд і тым больш у гады Другой сусветнай вайны.

Сітуацыя змянілася пасля парламенцкіх выбараў 1947 г.[8], калі камуністы замацавалі сваю ўладу, выціснулі з палітычнага жыцця апазіцыю і пачалі паступовы пераход да рэалізацыі сацыялістычнай праграмы. З гэтага часу відавочным стала іх імкненне выкарыстаць не толькі імя і аўтарытэт пісьменнікаў, але і іх творчыя здольнасці, што прадугледжвала напісанне твораў, якія б адпавядалі новай рэчаіснасці. Ужо ў красавіку 1947 г. на Пленуме ЦК ПРП было заяўлена аб неабходнасці ўзмацніць ідэалагічнае ўздзеянне на інтэлігенцыю. Адзначалася, што яна павінна адкінуць «буржуазна-капіталістычныя канцэпцыі, варожыя дэмакратыі і рабочаму класу» і заняць прагрэсіўную пазіцыю[9]. У гэтым працэсе партыя брала на сябе арганізацыйныя і кантралюючыя функцыі.

Крокі па рэалізацыі пастаўленай задачы былі зроблены ўжо ў наступным месяцы, калі на пасяджэнні культурна-асветніцкай камісіі Палітбюро ЦК ПРП абмяркоўваліся пытанні па стварэнні картатэкі работнікаў культуры, распрацоўцы творчых планаў, кантролю за мастацкай дзейнасцю, прызначэнні на кіруючыя пасады людзей, блізкіх па поглядах да камуністаў [14, s. 141].

Штуршок да практычных дзеянняў па выкарыстанні творчага патэнцыялу інтэлігенцыі дала прамова прэзідэнта Польшчы Б. Берута на адкрыцці радыёстанцыі ва Уроцлаве 16 лістапада 1947 г. Ён адзначыў, што раней інтэлігенцыя «была аддзелена непрабіваемым мурам ад шырокіх народных мас, якія стварылі матэрыяльны падмурак для навукі, культуры і мастацтва, а цяпер творца, які фарміруе духоўную спадчыну жыцця народа, павінен унікаць у працоўны пульс народных мас, у іх жаданні і запатрабаванні, чэрпаць з хваляванняў і перажыванняў людзей творчае натхненне для ўласных намаганняў, галоўнай мэтай якіх павінна быць паляпшэнне ўзроўню жыцця народа» (цыт. па [7, s. 14]). Важнай умовай умацавання сувязей інтэлігенцыі з народам, па меркаванні Б. Берута, павінна была выступаць планавая работа ў галіне культуры і мастацтва [15, s. 90].

Выказаныя прэзідэнтам Польшчы ідэі былі развіты праз некалькі дзён намеснікам міністра культуры і мастацтва У. Сакорскім на 3-м з'ездзе Прафсаюза польскіх пісьменнікаў[10]. Ён адзначыў, што ў пасляваеннай краіне новая літаратура нараджаецца з цяжкасцямі па прычыне адсутнасці плана і партыйнага кантролю, а таму «задачай арганізатараў сучаснага жыцця ў Польшчы з'яўляецца дапамога пісьменніку ўбачыць сваю трагічную адзіноту на шляху адыходу ў мінулае» (цыт. па [14, s. 153]). Пад мінулым разумеліся творчыя падыходы, ідэі і канцэпцыі, якія дамінавалі ў міжваенны перыяд, а ў новых умовах былі аб'яднаны паняццем «фармалізм» і сталі аб'ектам барацьбы ўлад.

Адным з напрамкаў дзейнасці па выцясненні буржуазных перажыткаў і будаўніцтве новай культуры можна лічыць дыскусіі ў перыядычных выданнях. У другой палове 1948 г. у падобных публікацыях актыўна абмяркоўвалася пытанне наконт такога творчага метаду, як сацыялістычны рэалізм, выказваліся думкі аб неабходнасці барацьбы з касмапалітызмам і пакланеннем перад заходняй культурай, а таксама гучалі заклікі звярнуцца да савецкага вопыту ў галіне культуры [16, s. 54]. Той факт, што ў дыскусіях прымалі ўдзел асобы, цесна звязаныя з ПРП (С. Жулкеўскі, У. Сакорскі, Я. Котт), сведчыць аб праграмнасці выказванняў, аб тым, што гэта быў не просты абмен меркаваннямі.

Адначасова са спробамі надаць новы сэнс мастацкай творчасці (перш за ўсё літаратуры) і ідэалагічна перавыхаваць старую інтэлігенцыю адбывалася падрыхтоўка маладых кадраў. Меркавалася, што творцы, выхаваныя ў духу марксісцка-ленінскай ідэалогіі,

[6]*Hass L.* Inteligencja polska 1945–1980: postawy i zachowania. S. 73–74.
[7]Цэнзуру ўсіх публікацый першапачаткова ажыццяўляла створанае ў 1944 г. Ведамства інфармацыі і прапаганды. Праз некаторы час, 5 ліпеня 1946 г., было створана Галоўнае ўпраўленне кантролю прэсы, публікацый і відовішчаў. (Dekret z dnia 5 lipca 1946 r. o utworzeniu Głównego Urzędu Kontroli Prasy, Publikacji i Widowisk [Zasoby elektroniczne] // Dz. Ustaw. 1946. No. 34, poz. 210. S. 379. URL: https://isap.sejm.gov.pl/isap.nsf/DocDetails.xsp?id=WDU19460340210 (data odwołania: 28.07.2023).)
[8]*Козік Л. А.* Парламенцкія выбары 19 студзеня 1947 г. у палітычнай гісторыі Польшчы другой паловы 40-х гг. // Российские и славянские исследования : сб. науч. ст. Вып. 1. Минск : БГУ, 2004. С. 233–241.
[9]Archiwum ruchu robotniczego. T. 7. S. 256, 262–264.
[10]Прафсаюз польскіх пісьменнікаў быў створаны ў 1920 г., але ў гады Другой сусветнай вайны яго праца спынілася. Дзейнасць арганізацыі была аднаўлена ў верасні 1944 г. на вызваленай тэрыторыі Польшчы, дзе ўлада належала Польскаму камітэту нацыянальнага вызвалення (ПКНВ). У 1947 г. прафсаюз налічваў 400 членаў і 260 кандыдатаў у члены [1, s. 10; 12, c. 7].

змогуць паступова выцесніць старыя кадры і стануць тымі інжынерамі чалавечых душ, якія дапамогуць сфарміраваць новы светапогляд насельніцтва [11, с. 94–95]. І такія спадзяванні мелі пад сабой аснову, бо ў першыя пасляваенныя гады ў Польшчы з’явілася маладое пакаленне пісьменнікаў, якія з энтузіязмам успрынялі перамены і выступілі за стварэнне новага, рэвалюцыйнага мастацтва. І хаця старэйшае пакаленне з лёгкай рукі паэта Ю. Пшыбася паблажліва ахрысціла маладых пісьменнікаў «прышчавымі», менавіта яны (Я. Котт, В. Варашыльскі, А. Важык і інш.) задавалі тон у часопісе «Кузня» («Kuźnica»), дзе выступалі з крытыкай даваеннай літаратуры [7, s. 32].

На думку расійскага даследчыка Р. Р. Юсупава, першым практычным крокам па выхаванні новага пакалення інтэлігенцыі выступае семінар для маладых празаікаў і паэтаў, адмыслова арганізаваны ЦК ПРП у Небарове ў лютым 1948 г. На мерапрыемстве выступілі прадстаўнікі як літаратурнай «левіцы» (Я. Івашкевіч, С. Жулкеўскі, Я. Котт, А. Ват і інш.), так і авангарда (Р. Братны, В. Варашыльскі, Т. Бароўскі і інш.), якія заклікалі да партыйнасці літаратуры [12, с. 8]. Практыка правядзення падобных сустрэч працягвалася і ў наступныя гады, напрыклад у выглядзе з’ездаў маладых пісьменнікаў [9, s. 146].

## Задачы будаўніцтва сацыялістычнай культуры

У снежні 1948 г. у ідэйнай дэкларацыі навастворанай ПАРП былі акрэслены перспектывы будаўніцтва сацыялістычнага грамадства ў Польшчы. Адной з яго істотных праяў было названа разгортванне класавай барацьбы, складовай часткай якой выступала пераадоленне культурнай адсталасці насельніцтва. Дадзеную задачу планавалася здейсніць шляхам выцяснення «са свядомасці народных мас перажыткаў старога ладу, эгаізму, дэмаралізацыі, цемнаты, забабонаў і перадузятасці рознага роду», прывіцця масам сацыялістычнай свядомасці, выхавання іх у духу ахвярнасці ў імя Айчыны і «сапраўднага патрыятызму, які непадзельна звязаны з пралетарскім інтэрнацыяналізмам»[11].

У ідэйнай дэкларацыі ПАРП сцвярджалася, што на шляху развіцця сацыялістычнай культуры трэба пераняць «вялікія дасягненні прагрэсіўных творцаў усіх галін польскай культуры… звярнуцца да прагрэсіўных, гуманістычных і дэмакратычных традыцый польскай культуры, выкарыстаць вопыт тых перыядаў развіцця народнай культуры, якія былі непарыўна звязаны з барацьбой прагрэсіўных сіл польскага народа супраць рэакцыі»[12]. Адначасова з гэтым падкрэслівалася неабходнасць перамагчы «ў народнай культуры ўсялякі ўплыў рэакцыйных элементаў», заяўлялася, што новая культура, навука і мастацтва павінны быць звязаны з памкненнямі народных мас і «адлюстроўваць іх прагненні, выхоўваць народ у духу гуманізму, дэмакратыі, сацыялізму»[13]. Задачамі па фарміраванні сацыялістычнай культуры ў Польшчы былі названы поўная ліквідацыя непісьменнасці, развіццё вышэйшай адукацыі, выхаванне новых настаўніцкіх кадраў і паляпшэнне іх становішча, павышэнне ідэалагічнага ўзроўню адукацыі і насычэнне яе марксісцка-ленінскімі ідэямі, умацаванне сувязі дзеячаў навукі і культуры з народнымі масамі, стварэнне шырокай сеткі культурных устаноў у гарадах і вёсках, забеспячэнне доступу насельніцтва да ўсіх культурных дасягненняў і актыўны ўдзел народных мас у будаўніцтве новай культуры[14]. Кантроль за выкананнем гэтых задач ажыццяўляла кіраўніцтва ПАРП, а адказным за справы ў галіне культуры і ідэалогіі быў член Палітбюро ЦК ПАРП Я. Берман [17, s. 350]. Улічваючы той факт, што пасля вайны асноўным сродкам фарміравання грамадскай думкі было слова ў шырокім яго разуменні, то менавіта пісьменнікі – інжынеры чалавечых душ – павінны былі стварыць новую сацыялістычную культуру і новы светапогляд насельніцтва.

Да канца 1940-х гг. намаганнямі польскіх улад у краіне была адкрыта вялікая колькасць культурных устаноў, акрамя таго, былі забяспечаны тэхнічныя магчымасці для культурнага выхавання насельніцтва[15]. Пад кантроль дзяржавы перайшла праца сродкаў масавай інфармацыі, а таксама выдавецкая справа [10, s. 16].

З 1949 г. дзейнасць прыватных выдавецтваў і друкарань была абмежавана. Савет міністраў Польшчы 21 верасня 1949 г. апублікаваў распараджэнне, якое

[11]Źródła do dziejów Polski w XIX i XX wieku. T. 5. Lata 1945 – 1956 / ed.: A. Koseski [i in.]. Pułtusk : Wyż. Szk. Humanist. im. Aleksandra Gieysztora, 2003. S. 203–204.

[12]Ibid. S. 205. Польскі даследчык Т. Шарота адзначаў, што ў першыя пасляваенныя гады ўлады Польшчы выкарыстоўвалі савецкі досвед культурных пераўтварэнняў і актыўна звярталіся да польскіх і сусветных класічных твораў. Гэта знайшло адлюстраванне ў выданні прац класікаў польскай літаратуры. Прымальнымі лічыліся творы эпохі пазітывізму і асветы, больш асцярожна ставіліся да твораў эпохі рамантызму, аднак гэта не перашкаджала выдаваць творы А. Міцкевіча. (*Szarota T.* Historia kultury Polski Ludowej [Zasoby elektroniczne] // Dzieje Najnow. 1970. Rocz. 2, No. 3. S. 145. URL: http://rcin.org.pl/Content/49677/PDF/WA303_67765_A507-DN-R-2-3_Szarota.pdf (data odwołania: 10.05.2023).)

[13]Źródła do dziejów Polski w XIX i XX wieku. T. 5. S. 205.

[14]Ibid. S. 205.

[15]*Szarota T.* Historia kultury Polski Ludowej. S. 145.

прадугледжвала атрыманне дзяржаўнай канцэсіі на выдавецкую справу[16]. Аднак гэта было толькі першым крокам. Уся друкаваная прадукцыя павінна была атрымаць дазвол Галоўнага ўпраўлення кантролю прэсы, публікацый і відовішчаў. Выдавецтвам трэба было выконваць шэраг фармальных прадпісанняў. І нават пасля гэтага дзяржава магла адмовіць ім у выдзяленні паперы [18, s. 41]. Праблемы назіраліся і з распаўсюджаннем друкаванай прадукцыі, бо створанае ў студзені 1950 г. дзяржаўнае прадпрыемства «Дом кнігі» атрымала выключнае права на аптовы продаж выданняў. Больш за тое, у яго падпарадкаванне перайшло каля 100 прыватных кнігарань [15, s. 131]. Далейшым крокам па пашырэнні кантролю за вытворчасцю і распаўсюджаннем друкаванай прадукцыі стала стварэнне ў жніўні 1951 г. Цэнтральнага праўлення выдавецтваў, паліграфічнай вытворчасці і кнігарань [15, s. 157]. У гэтых умовах магчымасці пісьменнікаў рыхтаваць да друку свае творы ў прыватных выдавецтвах і захоўваць творчую незалежнасць скарачаліся, што адбівалася на іх матэрыяльным становішчы. Прадстаўнікі інтэлігенцыі былі вымушаны шукаць іншую працу альбо ісці на супрацоўніцтва з уладамі і выконваць іх патрабаванні да пісьменніцкай дзейнасці. Такім чынам, у канцы 1940-х – пачатку 1950-х гг. дзяржава мела шырокія магчымасці для ўплыву на творчае асяроддзе і выкарыстанне яго патэнцыялу.

## Задачы пісьменнікаў у фарміраванні сацыялістычнай культуры

Фарміраванне сацыялістычнай культуры, як і правядзенне індустрыялізацыі і калектывізацыі, пачалося ў краіне з 1949 г. ПАРП узяла пад кантроль дзейнасць пісьменнікаў і пачала вызначаць напрамак іх творчасці. У сваёй культурнай палітыцы польскае кіраўніцтва выкарыстоўвала досвед СССР (напрыклад, у рэзалюцыі ЦК УКП(б) «Аб палітыцы партыі ў галіне мастацкай літаратуры» (1925) была зафіксавана ключавая роля партыі ў вырашэнні ўсіх пытанняў, нават у выбары формы і зместу літаратурных твораў [19, с. 9]).

Практычным крокам па ажыццяўленні кантролю за развіццём культуры ў Польшчы стала стварэнне творчых саюзаў[17]. У студзені 1949 г. на 4-м агульным з’ездзе Прафсаюза польскіх пісьменнікаў, які праходзіў у г. Шчэціне, арганізацыя атрымала назву «Саюз польскіх пісьменнікаў». З падпарадкавання Цэнтральнай камісіі прафсаюзаў аб’яднанне перайшло пад кантроль Міністэрства культуры і мастацтва і аддзела культуры ЦК ПАРП [10, s. 75; 20, s. 44]. Як гаварыў старшыня СПП Л. Кручкоўскі, саюз, абапіраючыся «на свой партыйны актыў, марксісцка-ленінскую тэорыю, павінен стаць арганізатарам грамадскай свядомасці пісьменнікаў… іх калектыўнай адказнасці за ўсе з’явы ў пісьменніцкім асяроддзі» (цыт. па [20, s. 44]). На з’ездзе былі агучаны і патрабаванні дзяржаўных органаў да творчасці пісьменнікаў. Так, намеснік міністра культуры і мастацтва У. Сакорскі заявіў, што «не існуе ніякай творчасці па-за часам і па-за прасторай сваёй эпохі… як не існуе нейтральнай пазіцыі пісьменніка» (цыт. па [15, s. 112–113]). Гэту думку развіў член ЦК ПАРП, дырэктар Інстытута літаратурных даследаванняў Польскай акадэміі навук С. Жулкеўскі. Характарызуючы актуальныя задачы польскай прозы, ён адзначыў, што якасць твораў трэба правяраць адказам на пытанне: «Што зроблена для пабудовы сацыялізму ў Польшчы і як проза духоўна ўзбагаціла будаўнікоў сацыялізму?» (цыт. па [15, s. 113]). Працягам такіх разважанняў стала заява У. Сакорскага (якую падтрымалі пісьменнікі – члены ПАРП) аб неабходнасці выкарыстання метаду сацыялістычнага рэалізму[18]. Да прысутных на з’ездзе пісьменнікаў былі даведзены наступныя патрабаванні да творчасці: поўнае ангажыраванне чытача ў справы сацыялістычнага будаўніцтва, паказ у літаратуры сацыяльнага авансу новага чалавека, які расце адначасова з перабудовай краіны, а таксама засваенне ведаў аб развіцці грамадства [15, s. 113].

---

[16]Rosporządzenie Rady Ministrów z dnia 21 września 1949 r. w sprawie koncesjonowania przedsiębiorstw wydawniczych książek i druków nieperiodycznych [Zasoby elektroniczne] // Dz. Ustaw. 1949. No. 53, poz. 407. S. 1025. URL: https://isap.sejm.gov.pl/isap.nsf/download.xsp/WDU19490530407/O/D19490407.pdf (data odwołania: 28.04.2023). На падставе дадзенага дакумента Галоўнае ўпраўленне кантролю прэсы, публікацый і відовішчаў 8 лістапада 1949 г. апублікавала цыркуляр, у якім адзначалася, што недзяржаўныя выдавецтвы павінны да 14 лістапада 1949 г. падаць заяву на атрыманне канцэсіі. Калі гэта не будзе зроблена альбо не будзе атрыманы дазвол Міністэрства ўнутраных спраў, выдавецтва павінна спыніць сваю дзейнасць. (Arch. Państwowe w Rzeszowie. Woj. Urząd Kontroli Prasy, Publ. i Widowisk. Sygn. 59/47/0/3.2/88. K. 33. Warszawa, 8.11.1949 (Okolnik No. 5 Głównego Urządu Kontroli Prasy, Publikacji i Widowisk) [Zasoby elektroniczne]. URL: https://www.szukajwarchiwach.gov.pl/jednostka/-/jednostka/19979618 (data odwołania: 24.04.2023).)

[17]У дадзеным выпадку ўзорам можна лічыць таксама СССР, дзе з канца 1920-х гг. адбывалася ліквідацыя творчых аб’яднанняў, а ў 1932 г. быў створаны Саюз пісьменнікаў СССР [19, с. 10–14].

[18]Сярод даследчыкаў няма адзінага меркавання аб тым, калі ў Польшчы ў якасці асноўнага творчага метаду быў вызначаны сацыялістычны рэалізм. Адны гісторыкі лічаць, што гэта адбылося на з’ездзе СПП у Шчэціне ў 1949 г., а пазней, у 1950 г., на варшаўскім з’ездзе СПП яго рысы былі канкрэтызаваны [7, s. 15]. Іншыя даследчыкі адзначаюць, што ў 1949 г. сацыялістычны рэалізм не быў заяўлены як абавязковы метад. Сваю пазіцыю яны аргументуюць тым, што згадак пра яго няма ні ў рэзалюцыі, ні ў іншых прынятых дакументах, хаця гэта пытанне ўздымалася як у дакладах, так і ў дыскусіях, таму пачаткам насаджэння сацыялістычнага рэалізму трэба лічыць 1950 г., калі сутнасць метаду была выразна сфармулявана на 5-м з’ездзе СПП у Варшаве [10, s. 76].

Абавязковымі тэмамі польскай прозы станавіліся левае падполле ў гады Другой сусветнай вайны, адраджэнне Польшчы пры новай уладзе і роля ў гэтым партыі, класавая барацьба ў вёсцы, а таксама барацьба за мір [12, с. 10].

З 1949 г. актывізавалася і ідэалагічная работа ўлад з творчай інтэлігенцыяй. Кіраўніцтва ПАРП арганізавала знаёмства пісьменнікаў з марксізмам як вучэннем, якое раскрывае развіццё грамадства на шляху да сацыялістычнага будаўніцтва. На пасяджэнні партыйных пісьменнікаў 14 студзеня 1949 г. Я. Берман адзначыў, што пісьменнікі павінны актыўна будаваць сацыялізм, а іх творчасць павінна быць адлюстраваннем палітыкі [17, s. 360]. З мэтай рэалізацыі гэтай ідэі было прынята рашэнне аб арганізацыі ідэалагічнага ўплыву на творчае асяроддзе. Адметную ролю ў дадзеным працэсе павінны былі адыграць пісьменнікі – члены ПАРП[19]. Меркавалася, што яны змогуць уздзейнічаць на калег і звярнуць іх да сацрэалістычных канонаў творчасці. З гэтай мэтай для беспартыйных пісьменнікаў былі арганізаваны адмысловыя курсы, іх запрашалі на партыйныя сходы, дзе абмяркоўваліся актуальныя праблемы літаратуры ці палітычныя падзеі. Пастунова расла колькасць членаў партыі і кандыдатаў у члены партыі. Калі да канца 1951 г. з 422 членаў СПП 99 уваходзілі ў ПАРП, то ў чэрвені 1954 г. з 711 членаў СПП 216 уваходзілі ў ПАРП [1, s. 210; 11, c. 182; 15, s. 146; 21, s. 147–149].

На рэспубліканскай канферэнцыі партыйнага актыву работнікаў культуры і мастацтва ў маі 1949 г. Я. Берман адзначыў, што ў актуальных умовах ідэалагічнай барацьбы істотным чынам узрасла «роля літаратуры і мастацтва як форм ідэалагічнага фарміравання новага чалавека», і падкрэсліў, што «без уключэння літаратуры і мастацтва ў барацьбу за сацыялізм не атрымаецца змяніць свядомасць людзей»[20]. У якасці бліжэйшых перспектыў развіцця грамадства ён назваў максімальнае распаўсюджанне культуры і напаўненне яе новым зместам. Акрамя таго, Я. Берман падкрэсліў, што калі інстытуцыянальныя ўмовы для гэтага стварыла дзяржава[21], то забеспячэнне бібліятэк і іншых культурных устаноў выданнямі на актуальную тэматыку залежыць ад творчага патэнцыялу пісьменнікаў[22].

Больш дэталёва праблему новага зместу ў польскай літаратуры акрэсліў У. Сакорскі, які адзначыў, што ў апошні час назіраецца «дыспрапорцыя паміж запатрабаваннямі грамадства на творчасць і яе эфектыўнай прадукцыяй». На яго думку, прычына гэтага заключаецца ў тым, што творчая інтэлігенцыя ніяк не адмовіцца ад свайго стаўлення да «такіх важных пытанняў, як фармалізм і касмапалітызм у мастацтве, абстракцыянізм і экзістэнцыялізм у філасофіі бачання жыцця», больш таго, яна пазбягае «тэматыкі, якая датычыцца новых сацыялістычных канфліктаў», цікавіцца «маргінальнымі сенсацыямі жыцця, якія трактуюцца як пазачасавыя і агульныя для грамадства», і звяртаецца да псіхалагізму, што ў сукупнасці выступае праявай фармалізму, «варожага сацыялістычнай свядомасці»[23]. Такім чынам, У. Сакорскі падводзіў да высновы: калі пісьменнік прытрымліваецца ў сваёй творчасці фармалізму, то ён выступае прыхільнікам амерыканскага імперыялізму, «не верыць у сацыяльныя рэформы, пабудову лепшага, справядлівага свету, жыццёвыя сілы свайго народа» і яго будучыню[24].

У якасці прагрэсіўнай альтэрнатывы такому падыходу прапаноўваўся сацыялістычны рэалізм – «наватарскі творчы метад», які, па меркаванні Я. Бермана, «закладае індывідуальную афарбоўку ў творчасці кожнага пісьменніка», дае яму «поўную свабоду як у выбары тэматыкі, так і ў выбары праблематыкі, калі гэта з'яўляецца ўнёскам у пабудову новага жыцця і новага чалавека»[25].

[19]У снежні 1948 г. пісьменнікі – члены ПРП (17 чалавек) і Польскай сацыялістычнай партыі (11 чалавек) аб'ядналіся ў адну арганізацыю як члены ПАРП. У красавіку 1950 г. кіраўніцтва ПАРП, жадаючы мець моцны фактар уплыву ў СПП, вырашыла, што пісьменнікі павінны стварыць пярвічную партыйную арганізацыі пры галоўным праўленні аб'яднання. Тыя творцы, якія жылі па-за межамі Варшавы, станавіліся членамі партыйнай арганізацыі пры рэгіянальных аддзяленнях СПП. (*Jarosz D.* Działalność Podstawowej Organizacji Partyjnej PZPR przy Zarządzie Głównym Związku Literatów Polskich w latach 1949–1953: w świetle akt własnych [Zasoby elektroniczne] // Mazowieckie Studia Humanistyczne. 1999. Nr 5/1. S. 5–45. URL: https://bazhum.muzhp.pl/media//files/Mazowieckie_Studia_Humanistyczne/Mazowieckie_Studia_Humanistyczne-r1999-t5-n1/Mazowieckie_Studia_Humanistyczne-r1999-t5-n1-s5-45/Mazowieckie_Studia_Humanistyczne-r1999-t5-n1-s5-45.pdf (data odwołania: 24.06.2023).)

[20]Źródła do dziejów Polski w XIX i XX wieku. T. 5. S. 210.

[21]Калі ў 1946 г. у Польшчы існавала 943 бібліятэкі (з улікам філіялаў), то ў 1950 г. іх колькасць вырасла да 4193, да якіх трэба дадаць 18100 бібліятэчных пунктаў. Іх сукупны кніжны фонд складаў 10,4 млн тамоў. За 1946–1950 гг. павялічылася і колькасць выдадзеных кніг і брашур (з 3254 да 4611 друкаваных адзінак), а аб'ём тыражу вырас з 38,9 млн экз. да 118,9 млн экз. (Польша в цифрах. 1944–1961. Варшава : Центр. стат. упр. Пол. Нар. Респ., 1961. С. 89.)

[22]У польскіх даследаваннях адзначаецца, што за 1949–1953 гг. з бібліятэк былі выдалены 2,5 тыс. найменняў кніг. Яны былі прызнаны шкоднымі, а таму былі накіраваны на пераапрацоўку ў якасці макулатуры. (*Zajkowska J.* Pisarz versus historia. Recepcja twórczości Artura Gruszeckiego w PRL-u (rekonesans) // Białostockie Studia Literaturoznawcze. 2019. No. 14. S. 51. DOI: 10.15290/bsl.2019.14.04.) Можна меркаваць, што месца гэтых кніг павінна была заняць новая літаратура, якая б адказвала запатрабаванням улад. Такім чынам справа напаўнення бібліятэк вырашалася б тэхнічна – праз павелічэнне накладаў і колькасці аўтараў.

[23]Źródła do dziejów Polski w XIX i XX wieku. T. 5. S. 211. (У выступленні У. Сакорскага акцэнт быў зроблены не столькі на даваеннай творчасці пісьменнікаў, колькі на працягу імі ранейшых традыцый. Не апошнюю ролю ў крытыцы пісьменнікаў адыграў той факт, што ў канцы 1940-х гг. папулярнасцю сярод насельніцтва карысталіся перш за ўсё творы польскіх класікаў і так званая лёгкая літаратура, што не адпавядала інтарэсам улад [18, s. 32].)

[24]Źródła do dziejów Polski w XIX i XX wieku. T. 5. S. 211.

[25]Ibid. S. 212.

Па словах аднаго з ідэолагаў культурнай рэвалюцыі С. Жулкеўскага, «літаратурны твор павінен быць праявай ідэалагічнай дзейнасці» (цыт. па [17, s. 363]). У сувязі з гэтым былі сфармуляваны патрабаванні і да новых, прагрэсіўных мастацкіх твораў. З'явы ў іх павінны паказвацца «ў працэсе іх дыялектычнага развіцця», крытыку мінулага трэба асвятляць не проста з пункту гледжання распаду капіталізму, а з пункту гледжання яго прычын і наступстваў, заняпаду (і адначасова з паказам прагрэсіўнасці сацыялістычнага жыцця). Пісьменнікі павінны адлюстроўваць барацьбу старога з новым, а таксама паказваць прыстойнага чалавека, які робіць усё для будаўніцтва сацыялістычнай Айчыны. Былі патрабаванні і да вобразу новага героя – чалавека, які адказна ставіцца «да працы, ідэй міжнароднага братэрства, сяброўства з СССР, патрыятызму, партыі, барацьбы за новы, лепшы свет»[26].

Кіраўніцтва Польшчы лічыла, што пісьменнікі павінны «ўсведамляць веліч свайго паклікання», быць упэўненымі ў правільнасці сацыялістычнага рэалізму, разумець яго глыбінную сутнасць, таму неабходна забяспечыць цесны кантакт інтэлігенцыі з народам, наблізіць мастацтва да народных мас[27]. Так, 27 кастрычніка 1951 г. на партыйнай нарадзе, прысвечанай мастацкай творчасці, Я. Берман адзначаў, што творца павінен уважліва назіраць за грамадскімі падзеямі, адказваць на грамадскія запатрабаванні, быць удзельнікам барацьбы за пабудову сацыялізму. На думку палітычнага дзеяча, сучасны пісьменнік – гэта той, хто піша новыя творы і адначасова з'яўляецца прапагандыстам новага ладу [17, s. 363]. Такім чынам, праз свае мастацкія творы пісьменнікі павінны выхоўваць насельніцтва ў духу сацыялізму і прапагандаваць перамены ў грамадстве.

Можна заўважыць, што такая лінія польскіх улад у развіцці сацыялістычнай літаратуры мае адсылку да заяў А. А. Жданава на І Усесаюзным з'ездзе савецкіх пісьменнікаў (1934). Выступаючы перад прысутнымі, ён так апісаў абавязкі пісьменнікаў як інжынераў чалавечых душ: «...ведаць жыццё, каб умець яго праўдзіва адлюстраваць у мастацкіх творах, адлюстраваць... рэчаіснасць у яе рэвалюцыйным развіцці. Пры гэтым праўдзівасць і гістарычная канкрэтнасць мастацкага твора павінны адказваць задачам ідэйнага перавыхавання працоўных людзей у духу сацыялізму»[28].

Актыўны ўплыў дзяржаўна-партыйных органаў на дзейнасць творчай інтэлігенцыі не прынёс чаканых вынікаў. Частка пісьменнікаў не пажадалі пісаць пра сучаснасць у зададзеным уладамі накірунку[29], а творы тых пісьменнікаў, якія згаджаліся на гэта, не заўсёды адпавядалі чаканням партыі. Каб выправіць сітуацыю, праводзіліся сходы пярвічнай партыйнай арганізацыі пісьменнікаў, а таксама творчых секцый[30]. На іх абмяркоўваліся літаратурныя творы і пазіцыя асобных пісьменнікаў, праводзілася асветніцкая работа па напісанні твораў у адпаведнасці з патрабаваннямі сацыялістычнага рэалізму. Наведванне такіх мерапрыемстваў лічылася абавязковым для членаў СПП[31] [5, s. 108–109; 9, s. 175; 15, s. 154, 165–166, 167, 168, 172, 173, 180; 21, s. 151].

У канцы 1940-х – пачатку 1950-х гг. перагляду і крытыцы была падвергнута творчасць пісьменнікаў першых пасляваенных гадоў. Іх абвінавачвалі як у недастатковай ідэйнасці, так і ў спробах стварыць рэвалюцыйнае мастацтва, якое было заснавана на асаблівым падыходзе да марксізму[32]. У гэтых умовах распаўсюджанай у пісьменніцкім асяроддзі з'явай стала выступленне з самакрытыкай [9, s. 127, 129; 21, s. 156–157]. Згаданыя працэсы былі абумоўлены рэпрэсіямі і выключэннямі з СПП (у 1950 г. былі выключаны 20 % пісьменнікаў ад агульнай колькасці членаў аб'яднання). Дарэчы, крытэрыі прыналежнасці да СПП былі вызначаны на варшаўскім з'ездзе аб'яднання ў чэрвені 1950 г. і ўключалі ацэнку даваенных і сучасных творчых дасягненняў пісьменніка, а таксама яго ўдзел у працы творчых секцый [5, s. 105–106, 108; 12, с. 10; 20, s. 45]. Можна меркаваць, што дадатковай падставай для выключэння з СПП стала і ўнясенне ў яго статут у 1950 г. палажэння аб тым, што члены аб'яднання павінны складаць «перадавы аддзел работнікаў культуры народнай дзяржавы, дзяржавы, якая будуе сацыя-

[26]Źródła do dziejów Polski w XIX i XX wieku. T. 5. S. 213.
[27]Ibid. S. 213–215.
[28]Первый Всесоюзный съезд советских писателей. 1934 : стеногр. отчет / сост. С. С. Лесновский. М. : Совет. писатель, 1990. С. 6.
[29]Сярод такіх былі С. Дыгат, В. Жукроўскі, А. Рудніцкі, М. Праміньскі, А. Сандаўэр, П. Хэрц, Т. Бароўскі і інш. Некаторыя даследчыкі ўвогуле называюць пачатак 1950-х гг. эпохай маўчання [12, с. 11]. Польскі гісторык Д. Яраш адзначае, што спробы партыйных пісьменнікаў правесці выхаваўчую працу з П. Хэрцам былі няпростымі. Аднойчы апошні заявіў: «Не магу... сцвярджаць, што ідэі сацыялістычнага рэалізму нельга прыняць. <...> Не магу пагадзіцца з тым, што негатыўна стаўлюся да метадаў сацыялістычнага рэалізму. Дрэнна стаўлюся да вынікаў». А на пытанне аб тым, ці душыць яго партыя, П. Хэрц адказаў: «Як чалавека – не. Як пісьменніка – душыць» [21, s. 167].
[30]Рашэнне аб стварэнні творчых секцый СПП (прозы, паэзіі, драмы, сатыры, перакладу, літаратуры для дзяцей і моладзі) было прынята ў кастрычніку 1950 г. з мэтай «удасканалення рамяства і ідэалагічнага фарміравання» [15, s. 145].
[31]Членства ў СПП давала пісьменнікам магчымасць выдаваць творы, атрымліваць дзяржаўную стыпендыю, мець пэўныя прывілеі (уласнае жыллё, аўтамабіль, абслугоўванне ў спецыяльных крамах і сталовых, адпачынак у дамах творчасці і г. д.). Выключэнне з СПП разглядалася ўладамі як сродак уздзеяння на творчых дзеячаў, якія не згаджаюцца пісаць на актуальную тэматыку.
[32]Гэта датычылася маладых пісьменнікаў, якія выступалі за стварэнне новага, рэвалюцыйнага мастацтва, а таксама тых, хто супрацоўнічаў з часопісам «Адраджэнне» («Odrodzenie»). Доўгі час рэдакцыя гэтага выдання праводзіла ідэі «лагоднай рэвалюцыі», прапанаванай адным з пасляваенных ідэолагаў Е. Барэйшам. Пад уплывам крытыкі рэдакцыйнай палітыкі часопісы «Кузня» і «Адраджэнне» былі ліквідаваны ў 1950 г., а іх нішу ў літаратурнай перыёдыцы заняў часопіс «Новая культура» («Nowa kultura»).

лізм» (цыт. па [20, s. 45]). Да ліку такіх складана было аднесці, напрыклад, каталіцкіх пісьменнікаў.

Далёка не ўсе пісьменнікі пагаджаліся з навязанай ім роляй прапагандыстаў сацыялістычнага светапогляду. Адны з іх свядома пераходзілі ў публіцыстыку, іншыя не пісалі і не прымалі ўдзелу ў публічным жыцці [7, s. 126, 135, 140–141, 144]. Былі і тыя, хто выбраў эміграцыю. Яскравым прыкладам выступае паэт Ч. Мілаш, які ў маі 1951 г. заявіў аб нежаданні вяртацца ў Польшчу і папрасіў палітычны прытулак у Францыі[33] [9, s. 179]. У часопісе «Культура» («Kultura»), выданне якога ажыццяўляў Літаратурны інстытут у Парыжы, Ч. Мілаш патлумачыў, што зрабіў гэта ў той момант, калі «перайманне савецкіх узораў стала ў Польшчы абавязковым для пісьменнікаў»[34].

Варта прызнаць, што ў адносінах да творчых дзеячаў улады выкарыстоўвалі тактыку бізуна і перніка. З аднаго боку, яны патрабавалі ад інтэлігенцыі напісання твораў на зададзеную тэматыку ў лепшых традыцыях сацыялістычнага рэалізму, а з другога – заахвочвалі яе шляхам прызначэння дзяржаўных узнагарод, правядзення творчых конкурсаў і г. д. Рашэнне аб прызначэнні дзяржаўных узнагарод упершыню было прынята польскім урадам у 1949 г. і прымеркавана да 22 ліпеня (дата стварэння ПКНВ у 1944 г.). У тым жа годзе быў абвешчаны і конкурс твораў, прысвечаных грамадска-палітычным і сацыяльна-эканамічным пераменам у Польшчы[35] [15, s. 120, 125; 17, s. 359].

Крытыка папярэдняй творчасці, ідэалагічныя ўстаноўкі і матэрыяльнае заахвочванне з боку ўлад не давалі выніку ў выглядзе новых, запатрабаваных чытачом твораў. Не апошнюю ролю ў гэтым адыгрывала і цэнзура. На падставе архіўных дакументаў польскі даследчык К. Будроўска вызначыла, што з канца 1940-х гг. задачай Галоўнага ўпраўлення кантролю прэсы, публікацый і відовішчаў была барацьба з касмапалітызмам, каталіцызмам, недаацэнкай дасягненняў Польшчы і СССР, захапленнем Захадам, а таксама з перабольшваннем недахопаў у пасляваенным развіцці краіны. Паступова спіс таго, што трэба перафразаваць, скараціць, выкрэсліць альбо дадаткова патлумачыць, павялічваўся [18, s. 32–34]. Менавіта цэнзар даваў дазвол на публікацыю, а таксама вызначаў актуальнасць тэматыкі і праблематыкі кнігі, яе ідэалагічнае і грамадска-выхаваўчае значэнне. У выпадку перавыдання твора цэнзар не толькі ўказваў на ўмовы абнаўлення выдання (са зменамі ці без іх), але і даваў заключэнне наконт таго, ці падыходзіць кніга для школьных і публічных бібліятэк[36]. Усё гэта істотна ўскладняла працу пісьменнікаў. Часам іх не ратавала і аўтацэнзура.

У 1950 г. члены ПАРП, адказныя за культуру, прапанавалі ідэю арганізаваць выезд пісьменнікаў у вёскі і на прадпрыемствы з мэтай паказаць ім жыццё простых людзей. Такія паездкі дазвалялі ацаніць маштаб сацыялістычных пераўтварэнняў у краіне. Аднак з 200 пісьменнікаў, якія выказалі жаданне паўдзельнічаць у такой акцыі, паехалі толькі 80. Па выніках адной з такіх паездак А. Браўн, А. Мандальян і В. Варашыльскі нават падрыхтавалі твор «Вясна шасцігодкі»[37]. Аднак для большасці пісьменнікаў убачанае не стала натхненнем для напісання прац на вытворчую тэматыку [9, s. 130, 131, 148; 15, 162].

Літаратурнае пытанне разглядалася і на варшаўскім з'ездзе СПП у чэрвені 1950 г. Перш за ўсё былі канкрэтызаваны рысы сацыялістычнага рэалізму: аптымізм, гуманізм, вялікая актуальнасць, паказ новага чалавека – будаўніка сацыялізму, а таксама партыйная пазіцыя пісьменнікаў, у тым ліку беспартыйных [9, s. 134]. Агульны тон прамоў і паводзін выступоўцаў выклікаў у часткі прысутных прыгнечанае ўражанне. Пісьменнік М. Дамброўская запісала ў дзённіку: «З'езд, відавочна, меў мала агульнага з літаратурай, можа, толькі тое, што быў чымсьці падобны да ўрачыстага пахавання літаратуры і пісьменнікаў на карысць пісак – памагатых урада ва ўзмацненні ладу. Гэта быў нават не палітычны з'езд, а з'езд паслушэнства»[38].

Нягледзячы на несур'ёзнае ўспрыманне сацыялістычнага рэалізму, дзейнасць пісьменнікаў тым не менш стала важнай часткай культурнай палітыкі польскіх улад. Яна была абумоўлена рознымі фактарамі: шчырай верай у светлую будучыню, палітычнай сітуацыяй у краіне (рэпрэсіямі), насаджэннем марксісцка-ленінскай ідэалогіі і матэрыяльнай залежнасцю ад дзяржавы. Такія абставіны дазвалялі ўладам дыктаваць умовы творчым дзеячам. У студзені 1951 г. на пленарным пасяджэнні галоўнага праўлення СПП Е. Путрамент выразна акрэсліў задачу, якую партыя паставіла перад пісьменнікамі, –

[33] Пасля вайны Ч. Мілаш працаваў на пасадзе аташэ па культуры ў польскай амбасадзе ў Вашынгтоне, а з восені 1950 г. – у польскай амбасадзе ў Францыі [9, s. 38, 182].

[34] *Miłosz Cz.* Nie [Zasoby elektroniczne] // Kultura. 1951. No. 5 (43). S. 3. URL: https://staticnowyportal.kulturaparyska.com/attachments/6a/b7/51ac27b26a3de3d145e69b3c32b114db46bde8df.pdf (data odwołania: 28.04.2023).

[35] Першую ўзнагароду атрымалі верш М. Яструна «Аповед пра першыя дні» і верш В. Варашыльскага «Ліпеньская справаздача», другую ўзнагароду – верш Т. Бароўскага «Быт вызначае свядомасць» і апавяданне У. Махейка «Айчына без параду» [15, s. 125].

[36] Arch. Państwowe w Rzeszowie. Woj. Urząd Kontroli Prasy, Publ. i Widowisk. Sygn. 59/47/0/3.2/27. K. 33–34, 41–42. Пісьменнік М. Дамброўская 14 мая 1950 г. адзначала: «Цэнзура мае тры фазы. Пасля ацэнкі рукапісу ставяць штамп "можна набіраць". Набор ідзе другі раз да цэнзуры, каб атрымаць штамп "можна друкаваць", пасля друку – трэці раз да цэнзуры, каб атрымаць штамп "можна распаўсюджваць"». (*Dąbrowska M.* Dzienniki 1914–1965. T. 7. Rok 1950. Warszawa : Pol. Akademia Nauk, 2009. S. 65.)

[37] Выданне было прысвечана будаўніцтву прамысловых прадпрыемстваў у Польшчы ў межах рэалізацыі плана развіцця краіны на 1950–1955 гг.

[38] *Dąbrowska M.* Dzienniki 1914–1965. T. 7. S. 102.

дапамагчы рабочаму класу выканаць шасцігадовы план гаспадарчага развіцця (1950–1955). Прадстаўнікам інтэлігенцыі нават былі раздадзены заданні, прычыну невыканання якіх у вызначаны тэрмін трэба было тлумачыць. Падставай нагадаць пісьменнікам пра іх абавязкі перад дзяржавай і грамадствам з'яўляліся таксама ўрачыстыя даты і мерапрыемствы, да якіх трэба было напісаць хвалебныя творы[39] [9, s. 167; 21, s. 169–170].

У кастрычніку 1951 г. на нарадзе, прысвечанай мастацкай творчасці, Я. Берман заклікаў пісьменнікаў не пагарджаць «роляй агітатара і прапагандыста», а максімальна наблізіцца да жыцця простых людзей, што дазволіць пазбегнуць схематызму ў літаратурных творах [15, s. 159–160]. Апошняя з'ява была настолькі актуальнай, што неаднаразова станавілася прадметам дыскусій у перыядычных выданнях. Яе ўдзельнікі ўскосна выказвалі незадаволенасць адміністрацыйнымі метадамі кіравання культурай і вузкім разуменнем сацыялістычнага рэалізму як спосабу прыхарошвання рэчаіснасці [10, s. 88]. Дадатковым эпізодам у крытыцы польскай літаратуры стала выступленне прафесара Акадэміі грамадскіх навук (Масква) А. Ф. Мяснікова на сходзе творчых секцый СПП у сакавіку 1952 г. Ён заявіў, што літаратура сацыялістычнага рэалізму не можа пазбягаць жыццёвых канфліктаў, а недахопам твораў, якія ў апошні час з'явіліся ў СССР, было «няправільнае меркаванне аб знікненні канфліктаў паміж дабром і злом у савецкай рэчаіснасці і рашэнне толькі ўяўных канфліктаў паміж добрым і лепшым». А. Ф. Мяснікоў падкрэсліў, што трэба канцэнтравацца не толькі на вытворчых пытаннях у жыцці чалавека, але і на дэталях яго паўсядзённага асабістага жыцця, акрамя таго, варта надаваць значэнне форме літаратурнага твора [15, s. 167]. Фактычна ён даў польскім функцыянерам у сферы культуры сігнал таго, што неабходна больш шырока падыходзіць да разумення сацыялістычнага рэалізму ў творчасці.

Ужо ў снежні 1952 г. на пасяджэнні мастацкай рады пры Міністэрстве культуры і мастацтва Польскай Народнай Рэспублікі[40] было паднята пытанне аб неабходнасці больш гнуткай інтэрпрэтацыі сацыялістычнага рэалізму. Дадатковым фактарам перагляду ранейшых падыходаў стала выступленне берлінскага тэатра «Берлінер ансамбль» («Berliner Ensemble») з пастаноўкай твора Б. Брэхта «Мамаша Кураж і яе дзеці», якая істотным чынам адыходзіла ад канонаў сацыялістычнага мастацтва [1, s. 257; 15, s. 172–173]. Як адзначаюць польскія даследчыкі, менавіта ў снежні 1952 г. сталі заўважнымі першыя публічныя сумненні творчага асяроддзя ў правільнасці культурнай палітыкі партыі. Аднак выразную форму і масавы характар праяў яны набылі толькі ў 1953 г. Штуршком сталі падзеі ў СССР пасля смерці І. В. Сталіна і іх водгук у польскіх правячых колах. І хаця кіраўніцтва ПАРП не адмовілася ў гэты час ад сацыялістычнага рэалізму як асноўнага творчага метаду, самі пісьменнікі ужо выйшлі за яго межы, заклікаючы да больш шырокага разумення рэалістычнага мастацтва [1, s. 257–258; 17, s. 375]. Можна лічыць, што 1953 г. стаў пэўным рубяжом у дзейнасці СПП па рэалізацыі культурнай палітыкі Польшчы.

## Заключэнне

У 1949 г. у Польшчы пачалося будаўніцтва сацыялізму па сталінскай мадэлі. У культурнай палітыцы ўлад гэта адлюстравалася ў арганізацыі дзейнасці па фарміраванні сацыялістычнай свядомасці насельніцтва. Важная роля ў рэалізацыі пастаўленай мэты адводзілася СПП, які аб'ядноўваў пісьменнікаў і адначасова задаваў напрамак іх творчасці. Перад членамі арганізацыі была пастаўлена задача стварыць літаратуру ў лепшых канонах сацыялістычнага рэалізму з апорай на савецкі досвед, а таксама данесці марксісцкія ідэі да шырокіх мас.

Адміністрацыйнае кіраванне творчым працэсам, навязванне пэўных канонаў у ацэнцы мастацкіх твораў, умяшальніцтва цэнзуры і жорсткі кантроль за рэалізацыяй вызначаных партыйна-дзяржаўным кіраўніцтвам задач далі дваякі вынік. З аднаго боку, у канцы 1940-х – пачатку 1950-х гг. у Польшчы сталі з'яўляцца творы, прысвечаныя будаўніцтву сацыялізму і ролі ПРП (ПАРП) у гэтым працэсе. З другога боку, некаторыя пісьменнікі адмаўляліся працаваць у вызначаным зверху рэчышчы, пра што, праўда, не заяўлялі публічна. Адлюстраваннем іх пазіцыі выступалі адсутнасць твораў на зададзеную тэматыку, змена роду дзейнасці альбо эміграцыя.

Умяшальніцтва ў творчы працэс і спробы яго рэгламентацыі, пераважная арыентацыя на СССР

[39]Да іх ліку можна аднесці Нацыянальнае свята адраджэння Польшчы, якое з 1945 г. адзначалася 22 ліпеня – у дзень абвяшчэння Маніфеста ПКНВ. Яно замяніла Дзень незалежнасці 11 лістапада. (Ustawa z dnia 22 lipca 1945 r. o ustanowieniu Narodowego Swięta Odrodzenia Polski [Zasoby elektroniczne] // Dz. Ustaw. 1945. No. 32, poz. 194. URL: https://isap.sejm.gov.pl/isap.nsf/DocDetails.xsp?id=WDU19450320194 (data odwołania: 14.05.2023).) Сярод іншых урачыстых падзей гэтага перыяду былі, напрыклад, 70-годдзе І. В. Сталіна, 60-годдзе першага сакратара ПАРП Б. Берута, 25-годдзе са дня смерці Ф. Дзяржынскага і інш. [8, s. 123–138; 9, s. 215–217; 15, s. 128, 129, 155, 168; 21, s. 170].

[40]Мастацкая рада пры Міністэрстве культуры і мастацтва Польскай Рэспублікі была створана 30 студзеня 1952 г. У паўнамоцтвы рады ўваходзіла прыняцце рашэнняў аб асновах дзейнасці саюзаў і таварыстваў у сферы культурнай і мастацкай творчасці, прыём справаздач аб культурнай і мастацкай дзейнасці саюзаў і таварыстваў і ацэнка яе вынікаў, выказванне меркаванняў аб важнейшых культурных падзеях і інш. (Zarządzenie No. 24 Prezesa Rady Ministrów z dnia 30 stycznia 1952 r. w sprawie Rady Artystycznej przy Ministrze Kultury i Sztuki [Zasoby elektroniczne] // Prawo.pl. URL: https://www.prawo.pl/akty/m-p-1952-a-14-168,16803606.html (data odwołania: 10.05.2023).) У 1953 г. гэта ўстанова стала называцца радай культуры і мастацтва.

і адмаўленне дасягненняў заходняй культуры прывялі да зніжэння мастацкага ўзроўню польскай літаратуры. Распаўсюджанай з'явай у творчасці стаў схематызм, барацьба з якім пачалася ўжо ў 1951 г. У гэты перыяд так і не было напісана сапраўды значных мастацкіх твораў, якія вытрымалі выпрабаванне часам. На зніжэнне ўзроўню літаратуры звярнулі ўвагу і самі пісьменнікі, якія пад уплывам падзей у СССР у 1953 г. і іх водгуку ў Польшчы пачалі крытычна ацэньваць культурную палітыку польскіх улад і фактычна сталі адыходзіць ад сацыялістычнага рэалізму.

## Бібліяграфія

1. Fijałkowska B. *Polityka a twórcy (1948–1959)*. Warszawa: Państwowe Wydawnictwo Naukowe; 1985. 571 s.
2. Trznadel J. *Hańba domowa. Rozmowy z pisarzami*. Lublin: Wydawnictwo «Test» & Zakłady Wydawnicze «Versus»; 1990. 338 s.
3. Trznadel J. *Hańba domowa. Rozmowy z pisarzami*. Wydanie nowe rozszerzone. Warszawa: Wydawnictwo ANTYK Marcin Dybowski; 2006. 434 s.
4. Urbankowski B. *Czerwona msza, czyli uśmiech Stalina*. Warszawa: Alfa; 1998. 2 tomy.
5. Czarnik OS. *Między dwoma Sierpniami. Polska kultura literacka w latach 1944–1980*. Warszawa: Wiedza Powszechna; 1993. 432 s.
6. Murzański S. *Między kompromisem a zdradą. Intelektualiści wobec przemocy 1945–1956*. Warszawa: VOLUMEN; 1993. 272 s.
7. Jarosiński Z. *Nadwiślański socrealism*. Warszawa: Wydawnictwo IBL; 1999. 328 s.
8. Tomasik W. *Inżynieria dusz. Literatura realizmu socjalistycznego w planie «propagandy monumentalnej»*. Wrocław: Wydawnictwo Leopoldinum; 1999. 219 s.
9. Bikont A, Szczęsna J. *Lawina i kamienia. Pisarze wobec komunizmu*. Warszawa: Prószyński i S-ka; 2006. 584 s.
10. Rokicki K. *Literaci. Relacje między literatami a władzami PRL w latach 1956–1970*. Warszawa: Instytut Pamięci Narodowej – Komisja Ścigania Zbrodni przeciwko Narodowi Polskiemu; 2011. 592 s.
11. Юсупов РР. *Власть и интеллигенция. Из истории Польши XX столетия (1918–1980 гг.)*. Казань: Издательство Казанского университета; 1996. 312 с.
12. Юсупов РР. *Из истории Союза польских писателей (1945–1980 годы)*. Казань: Гран Дан; 2002. 83 с.
13. Torańska T. *Oni*. Warszawa: Wydawnictwo ISKRY; 2004. 559 s.
14. Krasucki E. *Międzynarodowy komunista. Jerzy Borejsza. Biografia polityczna*. Warszawa: Wydawnictwo naukowe PWN; 2009. 324 s.
15. Fik M. *Kultura Polska po Jałcie. Kronika lat 1944–1981*. Warszawa: Polonia Book Fund LTD; 1989. 835 s.
16. Ligarski S. Polityka władz komunistycznych wobec twórców kultury w latach 1945–1989. *Pamięć i Sprawiedliwość*. 2014;2:51–73.
17. Sobór-Świderska A. *Jakub Berman. Biografia komunisty*. Warszawa: Instytut Pamięci Narodowej; 2009. 620 s.
18. Budrowska K. *Literatura i pisarze wobec cenzury PRL 1948–1958*. Białystok: Wydawnictwo Uniwersytetu w Białymstoku; 2009. 331 s.
19. Водопьянова ЗК, Домрачева ТВ, Бабаева ЛМ, составители. Между молотом и наковальней. Союз советских писателей СССР. Документы и комментарии. Т. 1, 1925 – июнь 1941 г. Москва: РОССПЭН; 2011. 1023 с. Совместно с фондом «Президентский центр Б. Н. Ельцина».
20. Błażejowska J. Czołowy oddział pracowników kultury. *Biuletyn Instytutu Pamięci Narodowej.* 2011;3:39–47.
21. Jarosz D. *Polacy a stalinism 1948–1956*. Warszawa: Instytut Historii PAN; 2000. 244 s.

## References

1. Fijałkowska B. *Polityka a twórcy (1948–1959)*. Warszawa: Państwowe Wydawnictwo Naukowe; 1985. 571 s.
2. Trznadel J. *Hańba domowa. Rozmowy z pisarzami*. Lublin: Wydawnictwo «Test» & Zakłady Wydawnicze «Versus»; 1990. 338 s.
3. Trznadel J. *Hańba domowa. Rozmowy z pisarzami*. Wydanie nowe rozszerzone. Warszawa: Wydawnictwo ANTYK Marcin Dybowski; 2006. 434 s.
4. Urbankowski B. *Czerwona msza, czyli uśmiech Stalina*. Warszawa: Alfa; 1998. 2 tomy.
5. Czarnik OS. *Między dwoma Sierpniami. Polska kultura literacka w latach 1944–1980*. Warszawa: Wiedza Powszechna; 1993. 432 s.
6. Murzański S. *Między kompromisem a zdradą. Intelektualiści wobec przemocy 1945–1956*. Warszawa: VOLUMEN; 1993. 272 s.
7. Jarosiński Z. *Nadwiślański socrealism*. Warszawa: Wydawnictwo IBL; 1999. 328 s.
8. Tomasik W. *Inżynieria dusz. Literatura realizmu socjalistycznego w planie «propagandy monumentalnej»*. Wrocław: Wydawnictwo Leopoldinum; 1999. 219 s.
9. Bikont A, Szczęsna J. *Lawina i kamienia. Pisarze wobec komunizmu*. Warszawa: Prószyński i S-ka; 2006. 584 s.
10. Rokicki K. *Literaci. Relacje między literatami a władzami PRL w latach 1956–1970*. Warszawa: Instytut Pamięci Narodowej – Komisja Ścigania Zbrodni przeciwko Narodowi Polskiemu; 2011. 592 s.
11. Jusupov RR. *Vlast' i intelligentsiya. Iz istorii Pol'shi XX stoletiya (1918–1980 gg.)* [The authorities and the intelligentsia. From the history of Poland in the 20th century (1918–1980)]. Kazan': Izdatel'stvo Kazanskogo universiteta; 1996. 312 p. Russian.
12. Jusupov RR. *Iz istorii Soyuza pol'skikh pisatelei (1945–1980 gody)* [From the history of the Polish Writers' Union (1945–1980)]. Kazan': Gran Dan; 2002. 83 p. Russian.
13. Torańska T. *Oni*. Warszawa: Wydawnictwo ISKRY; 2004. 559 s.
14. Krasucki E. *Międzynarodowy komunista. Jerzy Borejsza. Biografia polityczna*. Warszawa: Wydawnictwo naukowe PWN; 2009. 324 s.
15. Fik M. *Kultura Polska po Jałcie. Kronika lat 1944–1981*. Warszawa: Polonia Book Fund LTD; 1989. 835 s.

16. Ligarski S. Polityka władz komunistycznych wobec twórców kultury w latach 1945–1989. *Pamięć i Sprawiedliwość*. 2014;2:51–73.

17. Sobór-Świderska A. *Jakub Berman. Biografia komunisty*. Warszawa: Instytut Pamięci Narodowej; 2009. 620 s.

18. Budrowska K. *Literatura i pisarze wobec cenzury PRL 1948–1958*. Białystok: Wydawnictwo Uniwersytetu w Białymstoku; 2009. 331 s.

19. Vodop'yanova ZK, Domracheva TV, Babaeva LM, compilers. *Mezhdu molotom i nakoval'nei. Soyuz sovetskikh pisatelei SSSR. Dokumenty i kommentarii. T. 1, 1925 – iyun' 1941 g*. [Between a rock and a hard place. Union of Soviet Writers of the USSR. Documents and comments. Volume 1, 1925 – June 1941]. Moscow: ROSSPEN; 2011. 1023 p. Co-published by B. N. Yeltsin Presidential Center Foundation.

20. Błażejowska J. Czołowy oddział pracowników kultury. *Biuletyn Instytutu Pamięci Narodowej*. 2011;3:39–47.

21. Jarosz D. *Polacy a stalinism 1948–1956*. Warszawa: Instytut Historii PAN; 2000. 244 s.

*Статья поступила в редколлегию 20.05.2023.*
*Received by editorial board 20.05.2023.*